# АБ КАНФЕСІЙНАЙ ПАЛІТЫЦЫ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ: АД ПЕРАВАГІ ЎНІЯЦТВА ДА ПАНАВАННЯ ПРАВАСЛАЎЯ (XVIII – 30-я гг. XIX ст.)

**Г. А. Попчанка**
**МДПУ імя І. П. Шамякіна (Мазыр)**

Уніяцтва – унікальны культурны феномен на беларускіх землях, які адначасова вызначаў рэлігійныя супярэчнасці часу, стаў месцам спаткання дзвюх хрысціянскіх канфесій і сінтэзаваў на мясцовай глебе розныя культурныя традыцыі Беларусі, што ахапілі глыбокія пласты жыцця людзей, асветы, мастацтва. Уніяцтва стваралася на спрадвечным візантыйска-славянскім падмурку і развівалася ва ўзаемадзеянні дзвюх тэндэнцый: абароны чысціні і недатыкальнасці ўсходняга абраду і прыстасавання да заходніх запазычанняў, якія то ўжываліся разам, то спрачаліся за прыярытэт, чым забяспечвалі дынаміку культурна-гістарычнага «партрэта» ўніяцтва.

Архітэктура ўніяцкіх храмаў з моманту свайго афіцыйнага абвяшчэння мела цэлы комплекс мастацкіх і канструктыўных сродкаў, якія развіліся ў нетрах праваслаўнага і каталіцкага дойлідства. Сінтэз асаблівасцей як праваслаўнай, так і каталіцкай традыцый стаў у наступным



МГПУ им. И. П. Шамякина

стагоддзі пачаткам фарміравання ўніяцкай архітэктуры, заснаванай на двухвектарным працэсе развіцця. Уніяцкая спадчына Беларусі з'яўляецца ўнікальнай з'явай у архітэктуры XVIII – першай трэці XIX ст. і ставіць яго ў адзін шэраг з лепшымі еўрапейскімі дасягненнямі культавага будаўніцтва.

Новая канфесія, створаная паводле Берасцейскай царкоўнай уніі 1596 г., з'явілася ў выніку як знешніх, так і ўнутраных абставін. У другой палове XVIII ст. уніяцкая царква займала ў Беларусі першае месца па колькасці храмаў і вернікаў. Колькасць уніяцкіх прыходаў складала больш за 70 % агульнай колькасці прыходаў усіх хрысціянскіх канфесій. Напярэдадні падзелаў Рэчы Паспалітай сярод сельскага насельніцтва ўніятаў было каля 80 % [7, с. 14].

Структура ўніяцкай царквы была дастаткова разгалінаванай. На тэрыторыі беларускіх і часткова на ўкраінскіх землях дзейнічала Кіеўская ўніяцкая мітраполія. Яе ўзначальваў мітрапаліт Кіеўскі і Галіцкі, рэзідэнцыі якога знаходзіліся ў Навагрудку і Вільні. Да гэтай мітраполіі ставіліся Полацка-Віцебскае архіепіскапства на чале з архіепіскапам Полацкім, біскупам Віцебскім, Аршанскім, Мсціслаўскім, Магілёўскім і ўсяе Беларусі, а таксама 9 біскупстваў на чале з іх біскупамі. Біскупствы, у сваю чаргу, падзяляліся на дэканаты, а дэканаты – на прыходы (парафіі) [3, с. 5].

Адным з важных накірункаў дзейнасці ўніяцкай царквы было наладжванне адпаведнай уласнай спецыфікі і арыентаванай на патрэбы грамадства сістэмы адукацыі. Яе найбольшая актыўнасць у гэтай сферы прыпадае на першую чвэрць XVIII ст., калі праз стварэнне сеткі навучальных устаноў на беларускіх землях і праз замежныя калегіі ўдалося выгадаваць новую генерацыю духавенства, што ўмацавала царкву і ўзняла яе прэстыж. А ў новых рэаліях эпохі Асветніцтва пераход у рукі базыльян школьнай справы езуітаў і ўрадавая падтрымка абумовілі вялікую і карысную ролю ўніяцкіх школ у развіцці грамадскай адукацыі і асветы на Беларусі. Акрамя таго, склад і змест базыльянскіх бібліятэк Беларусі з'яўляецца паказчыкам адукаванасці тагачаснага беларускага грамадства, гаворыць на карысць таго, што духавенства з акадэмічнай адукацыяй імкнулася даць народу, моладзі зерні свецкай культуры.

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай на беларускіх землях пачынаюць мяняцца суадносіны паміж рознымі веравызнаннямі і іх месцам у грамадскім жыцці. Канфесійная сітуацыя змяняецца на карысць праваслаўя, нягледзячы на тое, што ўрадавая палітыка ў дачыненні да ўніяцкай і каталіцкай канфесій спачатку была даволі стрыманай і памяркоўнай. Гэты курс быў разлічаны на тое, каб выклікаць лаяльнасць і прыхільнасць новых

МГПУ им. И. П. Шамякина

падданых да Расіі і яе ўлад, а таксама атрымаць давер тых, хто застаўся ў межах Рэчы Паспалітай. Вернікаў-уніятаў разглядалі як праваслаўных, якія пад ціскам прынялі юрысдыкцыю папы рымскага і якія пад любой падставай былі схільныя яе парушыць.

Першыя ўказы Кацярыны II не закранулі царкоўную структуру трох асноўных канфесій на далучанай тэрыторыі. Яны тычыліся толькі духавенства, якое павінна было прынесці прысягу на вернасць расійскай імператрыцы. Манахам, якія не пажадалі прынесці прысягу, дазвалялася выехаць за мяжу. Пры гэтым было агаворана, што калі кляштары застануцца пустымі, то іх вёскі неабходна «ўзяць у казённае кіраванне» (указ ад 28 мая 1772 г.) [1, с. 11].

Больш складана вырашаліся праблемы, што тычыліся структуры і кіравання ўніяцкай царквой. Гэтаму пытанню было прысвечана пасяджэнне Савета 10 снежня 1772 г. На ім у прысутнасці імператрыцы быў абвешчаны ўказ, згодна з якім уніятам быў пакінуты Полацкі арцыбіскуп Я. Смагаржэўскі. Беларускаму генерал-губернатару ставілася ў абавязак забараняць уніяцкаму духавенству звяртаць у сваю веру праваслаўных [2, с. 20].

Канфесійнай стратэгіяй самадзяржаўя ў наступныя дзесяцігоддзі стала абмежаванне ўплыву ўніяцкай царквы праз стымуляванне пераходу ў пануючую веру насельніцтва краю. Перш за ўсё, духавенства і сялянства. [3, с. 20].

У 1780 г. Кацярына II выдала ўказ, у якім уніятаў запрашалі да пераходу ў праваслаўе. Па звестках Магілёўскага праваслаўнага епіскапа Г. Каніскага па яго епархіі яны склалі 414 573 чал. і 95 цэркваў.

У 1793 г. расійская імператрыца даручыла Херсонскаму архіепіскапу Яўгенію Булгарысу даць прапановы, «как лучше и приличнее можно польских униатов обратить» у праваслаўе. Адказам стала яго 70-старонкавая запіска «О наилучшем способе воссоединения униатов с православной церковью» [4, с. 3].

Указ ад 22 красавіка 1794 г. аб «ухіленні перашкод да звароту ўніятаў да праваслаўнай грэчаскай царквы» таксама садзейнічаў такім пераходам. На працягу 1794–1796 гг. у праваслаўе перайшло каля 1,5 мільёна вернікаў у Беларусі [4, с. 96].

Новым указам расійскай імператрыцы ад 19 красавіка 1795 г. былі скасаваны ўсе ўніяцкія епархіі, акрамя Полацкай. Папа Пій VI даручыў рымска-каталіцкаму мітрапаліту С. Богушу-Сестранцэвічу ажыццяўляць кіраўніцтва над уніятамі.

Пры Паўле I па-ранейшаму адбывалася ўпарадкаванне межаў епархій. На тэрыторыі Беларускай губерні працягвала дзейнічаць Полацкае ўніяцкае арцыбіскупства на чале з І. Лісоўскім. З 26 студзеня 1798 г. уніяты былі падпарадкаваны дэпартаменту рымска-каталіцкіх



МГПУ им. И. П. Шамякина

спраў, які выдзеліўся ў асобны орган з юстыц-калегіі. У красавіку 1798 г. створаны дзве новыя епархіі: Брэсцкая (на тэрыторыі Мінскай і Літоўскай губерняў) на чале з біскупам А. Гланеўскім і Луцкая на чале з біскупам З. Лявінскім [5, с. 112].

У 1801 г. Аляксандр І падпісаў новы рэгламент, у якім была вызначана сфера дзейнасці біскупаў у дачыненні да манаскіх ордэнаў. Паводле гэтага дакумента, яны не маглі ўмешвацца ў справы кіравання кляштарамі, якія падпарадкоўваліся правінцыялам. Аднак біскуп атрымаў права візітацыі кляштараў, што знаходзіліся на тэрыторыі падпарадкаванай яму епархіі. Правінцыялы ж павінны былі інфармаваць архірэя аб выніках выбараў, асабістым складзе і стане фінансаў манастыроў. Зноў была пацверджана абарона на адносіны правінцыялаў з замежным кіраўніцтвам ордэнаў. У выпадку смерці правінцыяла ордэн прадстаўляў свайго кандыдата на зацвярджэнне ў рымска-каталіцкую калегію ў Пецярбургу [3, с. 33].

Зыходзячы з традыцыйнага пастулата расійскіх уладаў, што ўніяцкай царквой павінен кіраваць манарх, а не Рым, Аляксандр І зменшыў уплыў папы рымскага на жыццё царквы і падпарадкаваў яе органам дзяржаўнага кіравання. Спачатку – створанаму згодна з Маніфестам ад 25 ліпеня 1810 г. Галоўнаму ўпраўленню духоўнымі справамі розных (замежных) веравызнанняў на чале з князем А. Галіцыным [6, с. 38].

У 1817 г. яно адышло ў падпарадкаванне Міністэрства духоўных спраў і народнай асветы. У сферу кампетэнцыі Дэпартамента духоўных спраў увайшлі справы ўсіх веравызнанняў, у тым ліку і ўніяцкага [6, с. 38].

Да пачатку 1820-х гг. становішча ўніяцкай царквы на беларускіх землях стабілізавалася. Яна атрымала пэўны юрыдычны статус у дзяржаве і знаходзілася пад кантролем расійскага ўрада.

Расійскім уладам удалося схіліць да супрацоўніцтва пэўную частку духавенства. На чале епархій былі пастаўлены людзі, лаяльныя да царскай палітыкі, здольныя да кампрамісаў, згодніцтва, супрацоўніцтва. Адным з іх стаў біскуп І. Сямашка. Разам з іншымі ўніяцкімі епіскапамі В. Лужынскім і А. Зубко яны свядома праводзілі палітыку «ачышчэння старажытных звычаяў ад лацінскіх запазычанняў», якая прывяла да зліцця з Рускай праваслаўнай царквой.

У 1828 г. у Расійскай імперыі было чатыры ўніяцкія епархіі: Полацкая, Берасцейская, Віленская, Луцкая. Згодна з указам ад 22 красавіка 1828 г. замест іх былі заснаваны дзве – Літоўская і Беларуская епархіі [7, с. 15]. Скарачэннем колькасці епархій урад імкнуўся засцерагчы ўніяцкае духавенства ад каталіцкага ўплыву і стварыць больш выгадныя ўмовы для збліжэння ўніятаў з праваслаўнымі.

МГПУ им. И. П. Шамякина

Паскорыла гэты працэс і паўстанне 1830–1831 гг., у якім прынялі актыўны ўдзел і базыльянскія манахі. Указам грэка-ўніяцкай Калегіі ад 14 чэрвеня 1833 г. у Літоўскай уніяцкай епархіі было скасавана 13 кляштараў, а ў беларускай – 21 [7, с. 15].

У чэрвені 1835 г. загадам Мікалая I у Пецярбургу з высокіх духоўных асоб і вядучых палітыкаў быў створаны Сакрэтны камітэт па ўніяцкіх справах. У склад камітэта ўвайшлі прадстаўнікі Сінода, яго обер-пракурор С. Нячаеў, мітрапаліт Маскоўскі, мітрапаліт Ноўгарадскі, архіепіскап Цвярскі, уніяцкі мітрапаліт Я. Булгак, літоўскі епіскап І. Сямашка, міністр унутраных спраў Д. Блудаў, генерал, князь Галіцын і інш. [7, с. 73]. Ужо па асабовым складзе Сакрэтнага камітэта можна меркаваць, якую ўвагу імператар надаваў уніяцкаму пытанню.

Вынікам дзейнасці высокіх асоб было скліканне Сабору, які пачаўся ў Полацкай Сафіі 12 лютага 1839 г. і абвясціў скасаванне рашэнняў Берасцейскай царкоўнай уніі 1596 г.

Такім чынам, на беларускіх землях адбылося ўз'яднанне ўніяцтва і праваслаўя ў адзіную канфесію. У межах Расійскай імперыі ўніяцкая царква афіцыйна спыніла сваё існаванне, хоць на практыцы працэс звароту ўніятаў у праваслаўе на беларускіх землях працягваўся да 1915 г.

Галоўнымі прычынамі скасавання ўніяцтва з'яўляліся: уніфікацыя далучаных земляў, унутраны раскол у царкве паміж белым духавенствам і манахамі базыльянскага ордэна; удзел уніяцкага духавенства ў паўстанні 1830–1831 гг.

Такім чынам, у канфесійнай палітыцы на беларускіх землях назіралася пэўная эвалюцыя ад адноснай верацярпімасці ў канцы XVIII ст., калі дазвалялася існаванне ўсіх канфесій на далучаных землях пры ўмове дзяржаўнага кантролю дзейнасці духавенства, да афіцыйнага скасавання ўніяцтва ў 1839 г.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Коялович, М. О. История воссоединения западнорусских униатов старых времен (до 1800 года) / М. О. Коялович. – Минск : Лучи Софии, 1999. – 208 с.

2. Бусько, С. И. Униатское наследие Беларуси [Электронный ресурс] / С. И. Бусько. – Режим доступа: http://kraeved.by/рубрики/научные_работы/униатское_наследие_беларуси.html. – Дата доступа: 17.03.2022.

3. Філатава, А. М. Канфесіі на Беларусі (канец XVIII–XX ст.) / А. М. Філатава [і інш]. – Мінск : ВП «Экаперспектыва», 1998. – 340 с.

4. Анішчанка, Я. К. Беларусь у часы Кацярыны II (1772–1796 гады) / Я. К. Анішчанка. – Мінск : ЗАО «Веды», 1998. – 162 с.

5. Бирало, А. А. Философская и общественная мысль в Белоруссии и Литве в конце XVII – середине XVIII вв. / А. А. Бирало. – Минск : БГУ, 1971. – 180 с.

6. Трацяк, І. І. Беларускае каталіцкае духавенства ля вытокаў сацыякультурнай ідэнтыфікацыі / І. І. Трацяк. – Гродна : ГрДУ, 2013. – 57 с.

МГПУ им. И. П. Шамякина

7. Уніяцкая царква // Вялікае княства Літоўскае : ВКЛ : энцыклапедыя : у 2 т. / Беларус. навук.-даслед. ін-т дакументазнаўства і арх. справы / М. А. Абаленскі ; рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2005–2006. – Т. 1. – 2005. – С 114–116.

МГПУ им. И. П. Шамякина